***Інтэграваны ўрок. Падагульненне па раздзеле “Дзеяслоў”***

***Мэта ўрока -*** гатоўнасць вучняў выканаць заданне, разлічанае на веданне граматычных катэгорый і правіл правапісу дзеяслова.

***Задачы ўрока:*** паўтарыць граматычныя катэгорыі дзеясловаў: спражэнне, трыванне, зваротнасць, пераходнасць, правапіс суфіксаў і канчаткаў.

***Форма ўрока: інтэграваны ўрок***

***Ход урока:***

- Настаўнік абвяшчае тэму ўрока, даводзіць вучням яго парадак: на працягу ўрока яны будуць працаваць самастойна з заданнямі па тэме “Дзеяслоў”, якія сфарміраваны на аснове тэксту апавядання “Гальштучнік”, якое яны толькі што вывучалі на ўроку літаратуры. Заданні складзены ў адпаведнасці з НаШтоБузу, з якім яны былі азнаёмлены на першым уроку па вывучэнні раздзела “Дзеяслоў”. Першыя чатыры заданні, у адрозненне ад 5-га, аднолькавыя для ўсяго класа, яны будуць ацэньвацца шляхам самаацэнкі і ўзаемаацэнкі, бо разлічаны на падрыхтоўку да выканання 5 – га задання, якое настаўнік збярэ і ацэніць адзнакай.

- Вучні фармулююць мэту ўрока:




***І. Вучні ў парах выконваюць заданні***, складзеныя на матэрыяле апавядання Раісы Баравіковай “Гальштучнік” і разлічаныя на паўтарэнне розных граматычных катэгорый дзеяслова і яго правапісу. Можна карыстацца падручнікам, дапамогай настаўніка, аднакласнікаў. Пасля праверкі кожнага з чатырох заданняў дзеці скарыстоўваць сігнальныя карткі зялёнага, жоўтага і чырвонага колераў, каб паведаміць настаўніку пра ўзровень сваіх ведаў. Вынікі работ 1-4 заданняў карэктуюцца.

***1.Спражэнне дзеясловаў***

Устаўце прапушчаныя канчаткі, вызначыўшы спражэнне дзеясловаў.

А вунь той… нізенькі, што размаўля.. з самым кудлатым з іх. Ён – мастак. Геній! Толькі пра гэта сам яшчэ не здагадва..цца. Але праз дваццаць гадоў яго карціны

будуць самымі каштоўнымі не толькі на гэтай планеце. Глядзі, бач..ш, той, што залез на дрэва… Ён праз дзесяцігоддзе будз.. тут самым славутым архітэктарам. Пачн.. з каменных пірамід і законч..ць праектамі з жалезабетону.

**Самаправерка шляхам метаду непадымання рукі.**

***2.Трыванне і пераходнасць дзеясловаў***

Вызначце трыванне і пераходнасць дзеясловаў .

Вось тады і з’явілася на нашых экранах тая маленечкая зялёная планета, якая нагадвала невялікі шарык з ранняй сакаўной травы. Ні на якіх зоркавых картах яна не значылася, і мы  вырашылі зазірнуць на тую планету.

**Самаправерка па слайдзе:**




| З’явілася | Закончанае | Непераходны |
|---|---|---|
| Нагадвала | Незакончанае | Пераходны |
| Не значылася | Незакончанае | Непераходны |
| Вырашылі | Закончанае | Непераходны |
| Зазірнуць | Закончанае | Непераходны |

***3. Граматычныя формы дзеяслова***

Знайдзіце сказы, у якіх прысутнічаюць наступныя формы дзеяслова:

1. дзеяслоў абвеснага ладу ў форме цяперашняга часу, 3 асобы, адз.л.;
2. зваротны дзеяслоў у форме будучага часу;
3. інфінітыў;
4. зваротны дзеяслоў у форме цяперашняга часу;
5. дзеяслоў загаднага ладу.

*а. Яму, напэўна, бачацца наўкол зялёныя гаі ды парослыя сакаўною травою паляны.*

*б. Глядзі, бачыш таго, што залез на дрэва…*

*в. У сузор’і  Дзевы мы сустрэнемся з братамі па розуме і па эвалюцыйным развіцці.*

*г. Я паспеў заўважыць нейкае калматае стварэнне*

*д. Гэтая планета мае чырвоны колер, чым нагадвае Марс.*

<u>Адказы:</u> 1-     ; 2 -     ; 3 -     ; 4 -     ; 5 -     .

**Узаемаправерка ў парах па слайдзе:** 1-д, 2-в, 3-г,4-а, 5-б

***4. Правапіс дзеясловаў***

Успомніце правіла “Правапіс суфіксаў дзеясловаў”.  Устаўце на месца шматкроп’я неабходны суфікс  (-ва- ,  -ава-, -оўва-).

Адна з кветак нагад..ла зямную лілею…

Жыхары планеты размаўлялі на лацінскай мове, якая на Зямлі выкарыст..лася толькі ў медыцыне…

Дзікуны выказ..лі выключную прыязнасць.

Я пачаў тое - сёе даслед..ць з навакольнага расліннага свету.

**Узаемаправерка ў групах па слайдзе:**




***<u>II. Выніковае самастойнае выкананне заданняў па варыянтах на адзнаку</u>***

**I варыянт**

Вось тады і **з'явілася** ( __________ трыванне) на нашых экранах тая маленечкая зялёная планета, якая **нагад . . ла** (перах. – неперах.) невялікі шарык з ранняй сакаўной травы. Нідзе, ні на якіх зоркавых картах яна **(не)знач..лася**, таму цалкам верагодна, што мы маглі быць першымі, хто натрапіў на яе ў касмічнай бясконцасці. Не цяжка **здагадацца ( … спр.)**, што мы **выраш . . лі** зазірнуць на тую планету. Што і **зрабілі ( . . . час, . . . лік)**.

Зваротны(я) дзеяслоў(вы) : ____________________________________________________

Інфінітыў (вы) : ____________________________________________________________

**На 9- 10**

Ад дзеяслова выравшылі ўтварыце форму 3 асобы мн. ліку будучага часу:

____________________________________________________________________________

Які з выдзеленых дзеясловаў лішні? __________________________________________

Чаму? ______________________

Утварыце ад яго формы ўмоўнага і загаднага ладу________________________________

____________________________________________________________________________

**II варыянт**

Вось тады і **з'явілася ( . . . час, . . . лік, . . . род)** на нашых экранах тая маленечкая зялёная планета, якая **нагад . . ла** невялікі шарык з ранняй сакаўной травы. Нідзе, ні на якіх зоркавых картах яна **(не)знач..лася**, таму цалкам верагодна, што мы маглі быць першымі, хто натрапіў на яе ў касмічнай бясконцасці. Не цяжка **здагадацца,** што мы **выраш . . лі** (перах. – неперах.) зазірнуць **( … спр.)** на тую планету. Што і **зрабілі** ( __________ трыванне).

Зваротны(я) дзеяслоў(вы) : ____________________________________________________

Інфінітыў (вы) : ____________________________________________________________

**На 9- 10**

Ад дзеяслова вырашылі ўтварыце форму 3 асобы мн. ліку будучага часу:

____________________________________________________________________________

Які з выдзеленых дзеясловаў лішні? __________________________________________

Чаму? ______________________

Утварыце ад яго формы ўмоўнага і загаднага ладу________________________________

**III. Зваротная сувязь:**

На гаворачай дошцы дзеці размяшчаюць
зялёныя  сцікеры з рэфлексіяй " што спадабалася",
ружовыя  сцікеры з рэфлексіяй " што было цяжка",
жоўтыя  сцікеры з рэфлексіяй " што хацеў бы змяніць".